Источник: "Звязда" - 2014-02-22

Даты Падзеі Людзі

**1814** год — нарадзіўся (Польшча) Кольберг Оскар, польскі этнограф, фальклярыст, кампазітар. Збіраў фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы ў Польшчы, Літве, Беларусі. У кнізе «Беларусь — Палессе» змешчаны 723 песні, 105 нотных запісаў, зробленых у ваколіцах Віцебска, Кобрына, Магілёва, Мазыра, Мінска; 14 казак і паданняў, народная лексіка, апісанні адзення і жылля, звычаяў. Шмат матэрыялаў аб гістарычным і культурным мінулым многіх месцаў Беларусі, у тым ліку Жыровіц, Міра, Навагрудка і інш. Аўтар прац «Казкі з Палесся», «Вясельныя звычаі і абрады з Палесся», «Этнаграфічныя замалёўкі». Памёр у 1890 годзе.




**1889** год — нарадзіўся (г. Бежацк Цвярской губерні, Расія) у сям'і святара беспрыходскай турэмнай царквы вядомы беларускі мовазнавец і педагог Мікалай Якаўлевіч Байкоў. Па заканчэнні Маскоўскай духоўнай семінарыі (1913) працаваў у розных навучальных установах Мінска як выкладчык філасофскіх і педагагічных дысцыплін, у 1922—1930 гг. — вучоны сакратар слоўнікавай камісіі Інбелкульта і Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі. У сярэдзіне 1930 г. звольнены з пасады «як скампраметаваны ў друку і як чужы па сваім сацыяльным паходжанні». Зарабляў на жыццё выпадковымі заданнямі. Загінуў пасля 1945 г. Аўтар больш за 100 прац па педагогіцы, літаратуразнаўстве і мовазнаўстве. З суаўтарамі выдаў «Практычны расійска-беларускі слоўнік» (1924, з М. Гарэцкім), «Беларуска-расійскі слоўнік» (1925), «Расійска-беларускі слоўнік» (1928, абодва з С. Некрашэвічам), «Практычны беларускі вайсковы слоўнік» (1927, з А. Бараноўскім).

**1917** год — Мікалай II адбыў у Стаўку ваеннага камандавання ў Магілёў. Ён пакінуў Пецярбург, так і не прыняўшы рашэнне аб новым урадзе, да якога народ і Дума мелі б давер. А зрабіць гэта яму настойліва раілі не толькі свае, але і замежныя дыпламаты... Назад у сталіцу царом апошні расійскі імператар ужо не вернецца. Праз тыдзень па шляху ў Пецярбург, на вакзале ў Пскове, ён будзе вымушаны падпісаць адрачэнне ад прастола.

Было сказана

**Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:**

***«Кажуць: зло нараджае зло. А найчасцей — яго нараджае надзея на адпушчэнне грахоў».***